## ГЛАВА IX. Вырашэнне гаспадарчых спрэчак

**Артыкул 67. Тэрмін вырашэння гаспадарчых спрэчак**

Гаспадарчыя спрэчкі павінны быць разгледжаны ў месячны тэрмін з дня паступлення іскавай заявы або ўзбуджэння справы па ініцыятыве гаспадарчага суда.

**Артыкул 68. Парадак вядзення пасяджэння**

Парадак вядзення пасяджэння вызначаецца суддзёй, які старшынствуе ў пасяджэнні. Суддзя растлумачвае ўдзельнікам судовага працэсу іх правы і абавязкі і аказвае садзейнічанне ў ажыццяўленні правоў, якія ім належаць.

У пасяджэнні заслухоўваюцца прадстаўнікі істца і адказчыка, эксперт і іншыя асобы, якія ўдзельнічаюць у пасяджэнні. Суддзя павінен прадастаўляць кожнаму боку роўныя і поўныя магчымасці прад'яўляць любыя неабходныя для разгляду гаспадарчай спрэчкі доказы.

Пры разглядзе спрэчак судом у саставе трох суддзяў адзін з суддзяў з'яўляецца старшынствуючым па справе.

**Артыкул 69. Вырашэнне гаспадарчай спрэчкі пры непрадстаўленні запатрабаваных суддзёй матэрыялаў і без удзелу прадстаўнікоў бакоў**

Пры непрадстаўленні запатрабаваных суддзёй матэрыялаў справа можа быць разгледжана па матэрыялах, якія ёсць у ёй.

Пры няяўцы ў пасяджэнне гаспадарчага суда прадстаўнікоў бакоў спрэчка можа быць разгледжана ў іх адсутнасць, калі няяўка, на думку суддзі (суддзяў), не перашкаджае вырашэнню спрэчкі.

**Артыкул 70. Вырашэнне гаспадарчых спрэчак у месцы знаходжання прадпрыемстваў і арганізацый**

Гаспадарчы суд мае права вырашыць спрэчку ў месцы знаходжання прадпрыемства і арганізацыі.

Кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый абавязаны ў гэтым выпадку забяспечыць неабходныя ўмовы для правядзення пасяджэння.

**Артыкул 71. Адкладанне слухання справы**

Гаспадарчы суд мае права адкласці слуханне справы ў выпадках, калі справа не можа быць вырашана ў дадзеным пасяджэнні.

Аб часе і месцы правядзення наступнага пасяджэння суддзя паведамляе бакам вызначэннем або іншым пісьмовым дакументам.

**Артыкул 72. Прыпыненне вядзення справы і яго аднаўленне**

Гаспадарчы суд прыпыняе вядзенне справы ў выпадку немагчымасці разгляду дадзенай справы да вырашэння звязанай з ім іншай справы органам, які вырашае гаспадарчыя спрэчкі, або адпаведнага пытання кампетэнтнымі органамі.

Гаспадарчы суд мае права прыпыніць вядзенне справы па хадайніцтву боку або па сваёй ініцыятыве ў выпадку назначэння судом экспертызы або накіравання матэрыялаў у следчыя органы.

Гаспадарчы суд аднаўляе вядзенне справы пасля ўстаранення абставін, што выклікалі яго прыпыненне.

Аб прыпыненні вядзення справы і аб яго аднаўленні выносіцца вызначэнне.

Вызначэнне аб прыпыненні вядзення справы можа быць перагледжана ў парадку нагляду.

**Артыкул 73. Спыненне вядзення справы**

Гаспадарчы суд спыняе вядзенне справы, калі:

справа не падлягае вырашэнню ў гаспадарчым судзе;

маецца рашэнне органа, які вырашае гаспадарчыя спрэчкі, па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах;

заяўнік не прыняў меры да выканання яго абавязку па непасрэднаму ўрэгуляванню спрэчкі з адказчыкам і магчымасць такога ўрэгулявання страчана;

ісцец адмовіўся ад іску.

У выпадку спынення вядзення справы паўторнае звяртанне ў гаспадарчы суд па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах не дапускаецца.

Аб спыненні вядзення справы выносіцца вызначэнне, у якім могуць быць вырашаны пытанні аб размеркаванні паміж бакамі судовых расходаў, аб вяртанні дзяржаўнай пошліны з бюджэту.

Вызначэнне аб спыненні вядзення справы можа быць перагледжана ў парадку нагляду.

**Артыкул 74. Пакіданне іску без разгляду**

Гаспадарчы суд пакідае іск без разгляду, калі:

у вядзенні органа, які вырашае гаспадарчыя спрэчкі, маецца справа па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах;

заяўнік не звяртаўся ў банк за атрыманнем ад адказчыка запазычанасці, калі яна, згодна з заканадаўствам, павінна быць атрымана праз банк;

ісцец не прадставіў запатрабаваныя гаспадарчым судом матэрыялы, неабходныя для вырашэння спрэчкі;

заяўнік не прыняў мер да выканання яго абавязку па непасрэднаму ўрэгуляванню спрэчкі з адказчыкам і магчымасць такога ўрэгулявання страчана;

прадстаўнік істца не з'явіўся ў пасяджэнне суда па яго выкліку, і гэта перашкаджае вырашэнню спрэчкі.

Аб пакіданні іску без разгляду выносіцца вызначэнне, у якім могуць быць вырашаны пытанні аб размеркаванні паміж бакамі судовых расходаў, аб вяртанні дзяржаўнай пошліны з бюджэту, а таксама аб спагнанні штрафу.

Вызначэнне аб пакіданні іску без разгляду можа быць перагледжана ў парадку нагляду.

Пасля ўстаранення абставін, якія з'явіліся падставай для пакідання іску без разгляду, ісцец мае права звярнуцца з ім у гаспадарчы суд у агульным парадку.

**Артыкул 75. Прыняцце рашэння**

Пры вырашэнні гаспадарчай спрэчкі па сутнасці (задавальненне іску, адмова ў іску поўнасцю або часткова) гаспадарчы суд прымае рашэнне.

Рашэнне па справе прымаецца суддзёй (суддзямі) па выніках абмеркавання ўсіх акалічнасцей справы ў пасяджэнні гаспадарчага суда. Пры гэтым суддзя садзейнічае дасягненню пагаднення паміж бакамі.

У выпадках, калі паміж бакамі не дасягнута пагадненне, або пагадненне бакоў не адпавядае заканадаўству, фактычным акалічнасцям ці матэрыялам справы, або спрэчка вырашаецца без удзелу прадстаўнікоў абодвух бакоў ці аднаго з іх, рашэнне прымаецца суддзёй. Пры вырашэнні спрэчкі некалькімі суддзямі рашэнне прымаецца большасцю галасоў суддзяў.

Рашэнне выкладаецца ў пісьмовай форме і падпісваецца суддзёй, які старшынствуе ў пасяджэнні, а калі спрэчка вырашаецца некалькімі суддзямі — усімі суддзямі, што ўдзельнічаюць у пасяджэнні. Суддзя, які не згодны з рашэннем, можа выкласці ў пісьмовым выглядзе сваё асобае меркаванне, якое далучаецца да справы.

**Артыкул 76. Правы гаспадарчага суда пры прыняцці рашэння**

Пры прыняцці рашэння па гаспадарчай спрэчцы гаспадарчы суд мае права:

выходзіць за межы іскавых патрабаванняў, калі гэта неабходна для абароны правоў і законных інтарэсаў прадпрыемстваў і арганізацый;

абарачаць поўнасцю або часткова ў даход мясцовага бюджэту няўстойку (штраф, пеню), што спаганяецца, калі ісцец не прад'явіў патрабаванне аб санкцыях або дапусціў парушэнні заканадаўства, якія не змяншаюць адказнасці адказчыка;

змяншаць у выключных выпадках размер няўстойкі (штрафу, пені), якая падлягае спагнанню з боку, які парушыў абавязацельствы;

спаганяць у даход мясцовага бюджэту з вінаватага боку штраф за нявысылку ў тэрмін запатрабаваных судом матэрыялаў, а таксама за ўхіленне ад учынення дзеянняў, ускладзеных судом на бок, у памеры да 500 рублёў;

адтэрміноўваць або растэрміноўваць выкананне рашэння.

**Артыкул 77. Змест рашэння**

Рашэнне гаспадарчага суда складаецца з уводнай, апісальнай, матывіровачнай і рэзалютыўнай частак.

Ва ўводнай частцы ўказваюцца:

нумар справы, дата прыняцця рашэння;

назва бакоў;

цана іску;

прозвішчы суддзі (суддзяў), прадстаўнікоў бакоў і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у разглядзе справы, і іх пасады.

Пры разглядзе гаспадарчай спрэчкі ў месцы знаходжання прадпрыемства, арганізацыі аб гэтым указваецца ва ўводнай частцы рашэння.

Апісальная частка павінна змяшчаць:

кароткае выкладанне патрабаванняў істца, заяў, тлумачэнняў і хадайніцтваў бакоў і іх прадстаўнікоў, іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у разглядзе спрэчкі;

апісанне дзеянняў, праведзеных судом (агляд і даследаванне доказаў і азнаямленне з матэрыяламі непасрэдна ў месцы іх знаходжання).

У матывіровачнай частцы ўказваюцца:

абставіны справы, устаноўленыя судом;

прычыны ўзнікнення спрэчкі;

доказы, на падставе якіх прынята рашэнне;

змест пісьмовага пагаднення бакоў, калі яно дасягнута;

довады, па якіх суд адхіліў хадайніцтвы і доказы бакоў і іх прадстаўнікоў, іх прапановы па ўмовах дагавора або пагадненне бакоў;

заканадаўства, якім суд кіраваўся пры прыняцці рашэння.

Рэзалютыўная частка павінна ўтрымліваць вывад аб задавальненні іску або аб адмове ў іску поўнасцю ці часткова. Вывад суда не павінен залежаць ад наступлення або ненаступлення якіх-небудзь абставін (умоўнае рашэнне).

Пры задавальненні іску ў рэзалютыўнай частцы рашэння ўказваюцца:

назва боку, у карысць якога вырашана спрэчка, і боку, з якога праведзена спагнанне грашовых сум або які абавязаны выканаць пэўныя дзеянні, тэрмін выканання гэтых дзеянняў, а таксама тэрмін платы грашовых сум пры адтэрміноўцы ці растэрміноўцы выканання рашэння;

размер падлеглых спагнанню сум (асноўнай запазычанасці за матэрыяльныя каштоўнасці, выкананыя работы і аказаныя паслугі, няўстойкі, штрафу, пені і страт);

назва рахунку, з якога праводзіцца спагнанне грашовых сум;

назва маёмасці, якая падлягае перадачы, і месца яе знаходжання (па спрэчцы аб перадачы маёмасці);

назва, нумар і дата выканаўчага дакумента або іншага дакумента, па якому спагнанне праводзіцца ў бясспрэчным (безакцэптным) парадку, пры прызнанні такога дакумента непадлеглым выкананню, а таксама сума, што не падлягае спісанню.

Па спрэчцы, што ўзнікла пры заключэнні або змяненні дагавора, у рэзалютыўнай частцы ўказваецца рашэнне па кожнай спрэчнай умове дагавора, а па спрэчцы аб прымусе заключыць дагавор — умоў, на якіх бакі абавязаны заключыць дагавор.

У рэзалютыўнай частцы рашэння ўказваецца аб прызнанні дагавора несапраўдным поўнасцю або ў пэўнай частцы ў выпадках яго супярэчнасці заканадаўству.

Пры задавальненні заявы аб прызнанні акта несапраўдным у рэзалютыўнай частцы ўказваецца назва акта і органа, які яго выдаў, нумар акта, дата яго выдання, прызнаецца акт несапраўдным поўнасцю або часткова (у якой іменна частцы). Пры незадавальненні ўказваецца аб адмове ў задавальненні патрабаванняў заяўніка аб прывнанні акта несапраўдным.

Калі ў пасяджэнні гаспадарчага суда прадстаўнікамі бакоў па спрэчцы, якая разглядаецца, дасягнута пагадненне, што адпавядае заканадаўству, фактычным акалічнасцям і матэрыялам справы, суддзя выкладае ў рэзалютыўнай частцы рашэння ўмовы дасягнутага пагаднення.

У рэзалютыўнай частцы рашэння ўказваецца аб размеркаванні судовых расходаў паміж бакамі.

Пры ўдзеле ў справе некалькіх істцоў і адказчыкаў у рашэнні ўказваецца, як вырашана спрэчка ў адносінах да кожнага з іх.

Пры заключэнні бакамі міравога пагаднення гаспадарчы суд вызначэннем зацвярджае гэта пагадненне або адмаўляе ў гэтым і разглядае спрэчку па сутнасці.

**Артыкул 78. Рашэнне па першапачатковаму і сустрэчнамуісках**

Пры разглядзе першапачатковага і сустрэчнага іскаў у рашэнні ўказваюцца вынікі разгляду кожнага з іскаў.

**Артыкул 79. Аб'яўленне рашэння**

Прынятае рашэнне аб'яўляецца суддзёй у пасяджэнні пасля заканчэння разгляду справы. Суддзя мае права аб'явіць толькі рэзалютыўную частку рашэння.

**Артыкул 80. Вынясенне вызначэння і яго змест**

Калі гаспадарчая спрэчка не вырашаецца па сутнасці (адклад разгляду справы, прыпыненне, спыненне вядзення справы), гаспадарчы суд выносіць вызначэнне.

Вызначэнне гаспадарчага суда павінна ўтрымліваць:

назву суда, нумар справы і дату вынясення вызначэння, назву бакоў, цану іску, патрабаванні істца, прозвішчы суддзі (суддзяў), прадстаўнікоў бакоў і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у вырашэнні справы (з указаннем іх пасад);

кароткае выкладанне сутнасці спрэчкі або змест пытання, па якому выносіцца вызначэнне;

матывы вынясення вызначэння са спасылкай на заканадаўства;

вывад па разгледжанаму пытанню;

дзеянні, якія павінны ажыццявіць бакі, іншыя прадпрыемствы, арганізацыі і іх службовыя асобы ў тэрміны, назначаныя судом.

**Артыкул 81. Накіраванне рашэнняў і вызначэнняў**

Рашэнні і вызначэнні рассылаюцца бакам або ўручаюцца іх прадстаўнікам у 10-дзённы тэрмін з дня іх вынясення.

**Артыкул 82. Перагляд рашэння і вызначэння суддзёй.**

Суддзя (суддзі) мае права перагледзець рашэнне ў частцы накладзенага ім штрафу.

Суддзя мае права ў выпадку атрымання новых матэрыялаў перагледзець вызначэнне (акрамя вызначэнняў аб адмове ва ўзбуджэнні вядзення справы, аб спыненні вядзення справы і аб пакіданні іску без разгляду).

Заявы аб пераглядзе рашэння і вызначэння могуць быць пададзены бокам не пазней 15 дзён пасля атрымання копіі рашэння (вызначэння), якое падлягае разгляду ў той жа тэрмін.

Па выніках перагляду рашэння (вызначэння) выносіцца адпаведна рашэнне (вызначэнне), якое можа быць перагледжана ў парадку нагляду.

**Артыкул 83. Растлумачэнне і выпраўленне рашэння**

Суд па заяве боку мае права растлумачыць рашэнне, не змяняючы пры гэтым яго змест, па заяве боку або па сваёй ініцыятыве выправіць дапушчаныя ў рашэнні апіскі або арыфметычныя памылкі, не закранаючы сутнасці рашэння, а таксама дадаткова вырашыць пытанне аб размеркаванні судовых расходаў, калі гэта пытанне засталося не вырашаным судом.

Аб растлумачэнні рашэння, а таксама аб выпраўленні апісак або арыфметычных памылак выносіцца вызначэнне. Аб размеркаванні судовых расходаў прымаецца рашэнне.

## ГЛАВА X. Перагляд рашэнняў у парадку нагляду

**Артыкул 84. Асобы, якія маюць права ставіць пытанне аб пераглядзе рашэння**

Рашэнне гаспадарчага суда можа быць перагледжана ў парадку нагляду па заяве боку, па пратэсту пракурора або па ініцыятыве старшыні гаспадарчага суда або яго намесніка.

**Артыкул 85. Асобы, якія маюць права перагляду рашэння**

Перагляд рашэння ажыццяўляецца старшынёй або намеснікам старшыні гаспадарчага суда, які прыняў рашэнне.

Перагляд рашэння, прынятага ў парадку нагляду старшынёй гаспадарчага суда вобласці або яго намеснікам, а таксама ў выпадку, калі спрэчка вырашана старшынёй гаспадарчага суда вобласці, перагляд рашэння ў Вышэйшым Гаспадарчым Судзе Беларускай ССР ажыццяўляецца калегіяльна, у саставе Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР або яго намесніка і двух суддзяў.

Рашэнне па выніках перагляду прымаецца большасцю галасоў.

**Артыкул 86. Форма і змест заявы аб пераглядзе рашэння і пратэсту пракурора**

Заява аб пераглядзе рашэння і пратэст пракурора падаюцца ў пісьмовай форме і павінны змяшчаць назву органа, які прыняў рашэнне, нумар справы, дату прыняцця рашэння, назву бакоў, па якіх пастаўлена пытанне аб пераглядзе рашэння, са спасылкай на заканадаўства і матэрыялы справы.

Заява аб пераглядзе рашэння падпісваецца кіраўніком прадпрыемства, арганізацыі.

Пратэст падпісваецца пракурорам або яго намеснікам.

**Артыкул 87. Парадак падачы заявы аб пераглядзе рашэння. Гранічны тэрмін перагляду рашэння**

Заява, пратэст пракурора аб Старшыні дзяржаўнага суда, перагляздзе рашэння падаюцца які прыняў рашэнне.

У выпадку нязгоды з пастановай старшыні гаспадарчага суда вобласці зацікаўлены бок падае заяву Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР праз гаспадарчы суд вобласці, які прыняў рашэнне. У гэтым выпадку заява разам са справай накіроўваецца Вышэйшаму Гаспадарчаму Суду Беларускай ССР не пазней пяці дзён пасля паступлення заявы або пратэсту.

Заяўнік (пракурор) абавязан накіраваць другому боку копію заявы (копію пратэсту).

Да заявы (пратэсту) прыкладаюцца дакументы, якія пацвярджаюць накіраванне другому боку копіі заявы (пратэсту), а па заяве, акрамя таго, плату дзяржаўнай пошліны.

Рашэнне гаспадарчага суда можа быць перагледжана ў парадку нагляду не пазней года з дня прыняцця рашэння.

**Артыкул 88. Тэрмін падачы заявы і пратэсту пракурора аб пераглядзе рашэння**

Заява і пратэст пракурора аб пераглядзе рашэння гаспадарчага суда могуць быць пададзены не пазней аднаго месяца пасля атрымання копіі гэтага рашэння.

Падача заявы аб пераглядзе рашэння і прынясенне пратэсту пракурора не прыпыняюць выкананне рашэння.

**Артыкул 89. Вяртанне заявы аб пераглядзе рашэння і пратэсту пракурора**

Заява аб пераглядзе рашэння і пратэст пракурора не прымаюцца да разгляду і вяртаюцца, калі:

заява або пратэст падпісаны асобай, якая не мае права падпісваць іх, або асобай, службовае становішча якой не ўказана;

да заявы не прыкладзены доказы платы дзяржаўнай пошліны ва ўстаноўленым парадку і размеры, накіравання копіі заявы або пратэсту бакам;

заява або пратэст пададзены па заканчэнні тэрміну, устаноўленага для яго падачы, без хадайніцтва аб аднаўленні гэтага тэрміну, а таксама пры парушэнні парадку падачы заявы (пратэсту);

заява або пратэст адкліканы заяўнікам (пракурорам) да пачатку вядзення справы ў парадку нагляду.

Старшыня гаспадарчага суда або яго намеснік, правамоцныя разглядаць заяву або пратэст па сутнасці, могуць аднавіць тэрмін на падачу заявы або пратэсту, калі прызнаюць, што ён прапушчаны па ўважлівай прычыне.

**Артыкул 90. Перагляд рашэння Вышэйшым Гаспадарчым Судом Беларускай ССР**

Вышэйшы Гаспадарчы Суд Беларускай ССР, які пераглядае рашэнне ў парадку нагляду ў пасяджэнні (калегіяльна), мае права разгледзець заяву (пратэст) з удзелам прадстаўнікоў бакоў і пракурора.

**Артыкул 91. Тэрмін перагляду рашэння**

Рашэнне, прынятае ў гаспадарчым судзе, пераглядаецца ў парадку нагляду на працягу месяца пасля паступлення заявы або пратэсту.

**Артыкул 92. Паўнамоцтвы старшыні гаспадарчага суда або яго намесніка пры пераглядзе рашэння**

Па выніках перагляду рашэння старшыня гаспадарчага суда, яго намеснік маюць права:

пакінуць рашэнне без змянення;

змяніць рашэнне;

адмяніць рашэнне і прыняць новае рашэнне або перадаць справу на новы разгляд, або спыніць вядзенне справы, або пакінуць іск без разгляду.

Рашэнне гаспадарчага суда пераглядаецца ў поўным аб'ёме, незалежна ад довадаў, выкладзеных у заяве або пратэсце.

Старшыня гаспадарчага суда або яго намеснік пры пераглядзе рашэння мае права прыпыніць яго выкананне.

Пастанова Пленума Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР, прынятая па спрэчцы паміж прадпрыемствамі і арганізацыямі рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання, з'яўляецца канчатковай.

**Артыкул 93. Падставы да змянення або адмены рашэння**

Рашэнне гаспадарчага суда падлягае змяненню або адмене, калі яно супярэчыць заканадаўству або не адпавядае фактычным акалічнасцям і матэрыялам справы.

**Артыкул 94. Прыняцце пастановы аб пераглядзе рашэння**

Па выніках перагляду рашэння прымаецца матываваная пастанова.

**Артыкул 95. Змест пастановы аб пераглядзе рашэння**

Пастанова аб пераглядзе рашэння павінна змяшчаць:

назву органа гаспадарчага суда, у якім пераглядаецца рашэнне;

нумар справы і дату прыняцця пастановы;

назву бакоў;

назву бока, па заяве якога пераглядаецца рашэнне;

прозвішчы пракурора, які прынёс пратэст, старшыні гаспадарчага суда або яго намесніка, які прыняў пастанову, і асоб, што давалі тлумачэнні;

назва гаспадарчага суда, які вынес рашэнне, нумар справы, дату прыняцця рашэння, прозвішча суддзі;

кароткае выкладанне сутнасці рашэння;

падставы, па якіх пастаўлена пытанне аб пераглядзе рашэння;

матывы, па якіх прымаецца пастанова, са спасылкай на заканадаўства і матэрыялы справы;

вывады па выніках разгляду заявы аб пераглядзе рашэння або пратэсту;

дзеянні, якія павінны быць выкананы бакамі і суддзёй пры адмене рашэння і перадачы справы на новы разгляд.

**Артыкул 96. Абавязковасць указанняў, якія змяшчаюцца ў пастанове аб пераглядзе рашэння**

Указанні, якія змяшчаюцца ў пастанове аб пераглядзе рашэння, абавязковыя для гаспадарчага суда, што вырашае гаспадарчыя спрэчкі, пры новым разглядзе справы.

**Артыкул 97. Рассылка пастановы аб пераглядзе рашэння**

Пастанова аб пераглядзе рашэння рассылаецца бакам, пракурору, які прад'явіў іск і прынёс пратэст, а таксама гаспадарчаму суду, што прыняў рашэнне (пастанову), у 10-дзённы тэрмін з дня разгляду заявы або пратэсту.

**Артыкул 98. Перагляд вызначэнняў у парадку нагляду**

Вызначэнні, якія ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, могуць быць перагледжаны ў парадку нагляду, пераглядаюцца ў тым жа парадку, што і рашэнні.

## ГЛАВА XI. Перагляд рашэнняў гаспадарчага суда па абставінах, якія зноў адкрыліся

**Артыкул 99. Падставы перагляду**

Гаспадарчы суд можа перагледзець прынятае ім рашэнне па абставінах, што зноў адкрыліся і маюць істотнае значэнне для справы, якія не былі і не маглі быць вядомы заяўніку. У прыватнасці, такімі абставінамі могуць быць:

устанаўленне ўступіўшым у законную сілу прыгаворам суда заведама лжывага заключэння эксперта, падложнасці дакументаў або рэчавых доказаў, якія выклікалі прыняцце незаконнага або неабгрунтаванага рашэння;

устанаўленне ўступіўшым у законную сілу прыгаворам суда злачынных дзеянняў гаспадарчага суддзі і прадстаўнікоў бакоў;

адмена рашэння гаспадарчага суда, рашэння, прыгавора або пастановы суда ці пастановы іншага органа, якая паслужыла падставай да вынясення дадзенага рашэння.

**Артыкул 100. Парадак падачы заявы**

Заява аб пераглядзе рашэння па абставінах, якія зноў адкрыліся, можа быць пададзена гаспадарчаму суду не пазней трох месяцаў пасля ўстанаўлення абставін, што служаць падставай для перагляду.

Заяўнік абавязаны накіраваць другому боку копію заявы і прыкладзеных да яе дакументаў.

Да заявы прыкладаюцца дакументы, якія пацвярджаюць накіраванне копіі заявы другому боку і плату дзяржаўнай пошліны.

Пры падачы заявы па заканчэнні ўстаноўленага тэрміну або пры непрадстаўленні доказаў накіравання копій заявы і прыкладзеных да яе дакументаў другому боку, або нявыплаты дзяржаўнай пошліны яна да разгляду не прымаецца і вяртаецца заяўніку.

**Артыкул 101. Перагляд рашэння**

Перагляд рашэння гаспадарчага суда па абставінах, якія зноў адкрыліся, ажыццяўляецца гаспадарчым судом, прыняўшым рашэнне.

Па выніках перагляду рашэння выносяцца:

пры змяненні або адмене рашэння — рашэнне або пастанова;

пры пакіданні рашэння ў сіле — вызначэнне.

У выпадку паступлення заявы па абставінах, якія зноў адкрыліся, гаспадарчы суд мае права прыпыніць выкананне рашэння да заканчэння яго перагляду.

Рашэнні, пастановы і вызначэнні, прынятыя па выніках перагляду рашэння па абставінах, якія зноў адкрыліся, могуць быць перагледжаны ў парадку нагляду ў адпаведнасці з палажэннямі главы X гэтага Кодэкса.

## ГЛАВА XII. Выкананне рашэнняў

**Артыкул 102. Загад гаспадарчага суда і накіраванне яго для выканання**

Выкананне рашэння гаспадарчага суда праводзіцца на падставе загаду, які выдаецца гаспадарчым судом і з'яўляецца выканаўчым дакументам. Загад накіроўваецца адначасова з рашэннем.

Загады на спагнанне грашовых сум выдаюцца спагнаннікам. Пры спагнанні сум у даход бюджэту загады накіроўваюцца мясцовым фінансавым органам і выконваюцца ва ўстаноўленым парадку праз установы банка. Астатнія загады выконваюцца судовымі выканаўцамі.

У выпадку поўнага або частковага задавальнення першапачатковага і сустрэчнага іскаў загады на спагнанне выдаюцца асобна па кожнаму іску.

**Артыкул 103. Змест загада**

У загадзе гаспадарчага суда павінны быць указаны:

нумар справы, па якой выдадзены загад, дата прыняцця рашэння і выдачы загаду і тэрмін яго дзеяння;

рэзалютыўная частка рашэння.

Калі пры прыняцці рашэння ўстанаўліваецца адтэрміноўка або растэрміноўка выканання, у загадзе ўказваецца, з якога часу пачынаецца цячэнне тэрміну яго дзеяння.

У загадзе, які падлягае выкананню судовым выканаўцам або накіроўваецца фінансаваму органу, указваецца таксама адрас даўжніка.

Загад падпісваецца суддзёй і завяраецца пячаткай.

**Артыкул 104. Тэрмін для прад'яўлення загада да выканання**

Выдадзены спагнанніку загад можа быць прад'яўлены да выканання не пазней трох месяцаў пасля прыняцця рашэння або заканчэння тэрміну, устаноўленага пры адтэрміноўцы ці растэрміноўцы выканання рашэння, або пасля вынясення вызначэння аб аднаўленні прапушчанага тэрміну для прад'яўлення загада да выканання. У гэты тэрмін не залічваецца час, на які выкананне рашэння было прыпынена.

У выпадку немагчымасці выканання загада ўстановай банка або судовым выканаўцам і вяртання яго ў сувязі з гэтым без выканання новый трохмесячны тэрмін для прад'яўлення загада да выканання вылічваецца з дня яго вяртання.

Тэрмін для выканання рашэння перарываецца прад'яўленнем загаду да выканання.

**Артыкул 105. Выдача дубліката загада**

У выпадку страты загада гаспадарчы суд можа выдаць яго дублікат, калі спагнаннік звярнуўся з заявай аб гэтым да заканчэння тэрміну, устаноўленага для прад'яўлення загада да выканання. Аб выдачы дубліката загада выносіцца вызначэнне. Суд мае права прадоўжыць тэрмін дзеяння загада.

Да заявы аб выдачы дубліката загада павінны быць прыкладзены даведка ўстановы банка, судовага выканаўцы, органа сувязі аб страце загада або даведка прадпрыемства, арганізацыі аб страце загада і непрад'яўленні яго да выканання.

Даведка прадпрыемства, арганізацыі падпісваецца кіраўніком і галоўным (старшым) бухгалтарам прадпрыемства, арганізацыі.

**Артыкул 106. Адтэрміноўка або растэрміноўка выканання рашэння, змяненне спосабу і парадку выканання рашэння**

Гаспадарчы суд па заяве боку або па сваёй ініцыятыве мае права да заканчэння тэрміну, устаноўленага для прад'яўлення загада да выканання, адтэрмінаваць або растэрмінаваць выкананне рашэння, змяніць спосаб і парадак яго выканання.

Пры пратэрміноўцы або растэрміноўцы выканання рашэння гаспадарчы суд можа прыняць меры па забеспячэнню іску.

Аб адтэрміноўцы або растэрміноўцы выканання рашэння, змяненні спосабу і парадку яго выканання выносіцца вызначэнне, якое можа быць перагледжана ў парадку нагляду. У неабходных выпадках вызначэнне высылаецца ўстанове банка па месцы знаходжання даўжніка.

**Артыкул 107. Паварот выканання рашэння, спыненне спагнання па рашэнню**

Калі прыведзенае ў выкананне рашэнне зменена або адменена і прынята новае рашэнне аб поўнай або частковай адмове ў іску, або вядзенне справы спынена, або іск пакінуты без разгляду, боку вяртаецца ўсё тое, што з яго спагнана ў карысць другога боку па змененаму ў адпаведнай частцы рашэнню.

Выдача загаду на вяртанне спагнаных грашовых сум, маёмасці або яе кошту праводзіцца гаспадарчым судом па заяве прадпрыемства, арганізацыі, да якой прыкладаецца даведка, падпісаная кіраўніком і галоўным (старшым) бухгалтарам, аб тым, што сума, спагнаная па раней прынятаму рашэнню, спісана ўстановай банка або маёмасць адабрана судовым выканаўцам.

Калі не прыведзенае ў выкананне рашэнне было зменена або адменена і прынята новае рашэнне аб поўнай або частковай адмове ў іску, або вядзенне справы спынена, або іск пакінуты без разгляду, гаспадарчы суд выносіць вызначэнне аб поўным або частковым спыненні спагнання па змененаму або адмененаму ў адпаведнай частцы рашэнню.

**Артыкул 108. Адказнасць за невыкананне рашэння гаспадарчага суда**

За невыкананне рашэння гаспадарчага суда органам, на які ўскладзены абавязак па выкананню рашэння, суд мае права спагнаць штраф у размеры да 5000 рублёў у рэспубліканскі бюджэт.

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР**
**М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

5 чэрвеня 1991 г. гор. Мінск.

# ПАСТАНОВА Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

## Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Гаспадарчага працэсульнага кодэкса Беларускай ССР

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Гаспадарчы працэсуальны кодэкс Беларускай ССР з 1 ліпеня 1991 года.

2. Да ўвядзення ў дзеянне Гаспадарчага працэсуальнага кодэкса Беларускай ССР прымяняецца дзеючае заканадаўства, якое рэгулюе парадак разгляду гаспадарчых спрэчак.

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР**
**М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

5 чэрвеня 1991 г. гор. Мінск.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

## Закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

# Гаспадарчы працэсуальны кодэкс Беларускай ССР

### ГЛАВА I. Агульныя палажэнні

**Артыкул 1. Парадак вырашэння гаспадарчых спрэчак у Беларускай ССР**

Парадак вырашэння гаспадарчых спрэчак у Беларускай ССР вызначаецца Законам Беларускай ССР «Аб гаспадарчым судзе ў Беларускай ССР», гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі Беларускай ССР і Саюза ССР.

**Артыкул 2. Права звароту ў гаспадарчы суд**

Прадпрыемствы, установы і арганізацыі, у тым ліку сумесныя прадпрыемствы, дзяржаўныя і іншыя органы і іншыя юрыдычныя асобы, незалежна ад форм уласнасці [1] маюць права ва ўстаноўленым парадку звяртацца ў гаспадарчы суд за абаронай сваіх парушаных або аспрэчваемых правоў ці інтарэсаў, якія ахоўваюцца законам.

Адмова ад права на зварот у гаспадарчы суд несапраўдная.

**Артыкул 3. Узбуджэнне справы ў гаспадарчым судзе**

Гаспадарчы суд узбуджае справу па заявах:

зацікаўленых прадпрыемстваў і арганізацый;

дзяржаўных органаў па ахове прыроды;

іншых дзяржаўных органаў, якія звяртаюцца ў гаспадарчы суд у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Саюза ССР і Беларускай ССР;

пракурораў, якія звяртаюцца ў гаспадарчы суд у інтарэсах прадпрыемстваў і арганізацый.

Гаспадарчы суд мае права ўзбудзіць справу па сваёй ініцыятыве.

**Артыкул 4. Састаў гаспадарчага суда**

У састаў гаспадарчага суда ўваходзіць суддзя.

Старшыня гаспадарчага суда або яго намеснік мае права ўвесці ў састаў гаспадарчага суда дадаткова двух суддзяў.

У выпадках, устаноўленых артыкулам 65 гэтага Кодэкса, спрэчка можа быць вырашана без удзелу прадстаўнікоў бакоў.

**Артыкул 5. Абавязковасць патрабаванняў суддзі**

Патрабаванні суддзі, якія прад'яўляюцца ў межах правоў гаспадарчага суда ў сувязі з разглядам спрэчкі абавязковыя для ўсіх прадпрыемстваў, арганізацый, а таксама службовых асоб.

**Артыкул 6. Незалежнасць суддзяў і падпарадкаванне іх толькі закону**

Пры разглядзе спрэчак суддзі незалежныя і падпарадкоўваюцца толькі закону.

**Артыкул 7. Мова судаводства ў гаспадарчым судзе**

Судаводства па справах з удзелам бакоў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларускай ССР, ажыццяўляецца на беларускай мове.

Судаводства па справах з удзелам боку, які знаходзіцца на тэрыторыі іншай саюзнай рэспублікі, ажыццяўляецца на рускай мове.

Калі матэрыялы, якія накіроўваюцца ў Вышэйшы арбітражны суд СССР або ў гаспадарчыя ці арбітражныя суды іншых саюзных рэспублік, афармлены на беларускай мове, яны падлягаюць перакладу на рускую мову.

**Артыкул 8. Роўнасць бакоў**

Вырашэнне спрэчак у гаспадарчым судзе ажыццяўляецца на пачатках роўнасці ўдзельнікаў працэсу перад законам і судом незалежна ад форм уласнасці, месца знаходжання бакоў, падпарадкаванасці і іншых абставін.

**Артыкул 9. Галоснасць судовага працэсу**

Вырашэнне спрэчак у гаспадарчым судзе адкрытае, за выключэннем выпадкаў, калі гэта супярэчыць інтарэсам дзяржаўнай і камерцыйнай тайны або ёсць пярэчанне аднаго з бакоў.

**Артыкул 10. Законнасць і абгрунтаванасць рашэння**

Рашэнне гаспадарчага суда павінна быць законным і абгрунтаваным.

**Артыкул 11. Заканадаўства, на падставе якога вырашаюцца спрэчкі**

Гаспадарчы суд у Беларускай ССР у сваёй дзейнасці кіруецца Канстытуцыяй Беларускай ССР, законамі Беларускай ССР і Саюза ССР, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларускай ССР, Саюзным дагаворам, пагадненнямі і дагаворамі Беларускай ССР з іншымі рэспублікамі, іншымі заканадаўчымі і нарматыўнымі актамі.

**Артыкул 12. Абавязковасць рашэнняў гаспадарчага суда**

Рашэнні гаспадарчага суда (рашэнні, пастановы, вызначэнні) уступаюць у сілу неадкладна пасля іх прыняцця, калі іншае не ўстаноўлена ў рашэнні, і абавязковыя да выканання прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі і службовымі асобамі.

**Артыкул 13. Перагляд рашэнняў**

Рашэнні гаспадарчага суда могуць быць перагледжаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

[1] У далейшым прадпрыемствы і арганізацыі.

### ГЛАВА II. Падведамнасць і падсуднасць гаспадарчых спрэчак

**Артыкул 14. Гаспадарчыя спрэчкі, падведамныя гаспадарчаму суду**

Гаспадарчыя суды ў Беларускай ССР у адпаведнасці з устаноўленай кампетэнцыяй вырашаюць спрэчкі паміж прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі незалежна ад форм уласнасці і падпарадкаванасці, якія ўзнікаюць пры заключэнні, змяненні, скасаванні і выкананні гаспадарчых дагавораў або на іншых падставах, а таксама спрэчкі аб прызнанні несапраўднымі актаў дзяржаўных і іншых органаў, якія не маюць нарматыўнага характару, не адпавядаюць заканадаўству і закранаюць інтарэсы прадпрыемстваў і арганізацый, акрамя:

спрэчак, вырашэнне якіх у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Беларускай ССР аднесена да ведання іншых органаў;

спрэчак, вырашэнне якіх аднесена да кампетэнцыі Вышэйшага арбітражнага суда СССР;

спрэчак па падатках, якія спаганяюцца ў бюджэт у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Саюза ССР і Беларускай ССР;

спрэчак, якія ўзнікаюць пры ўзгадненні стандартаў і тэхнічных умоў;

спрэчак аб устанаўленні цэн на прадукцыю і тавары, а таксама тарыфаў на аказанне паслуг, калі гэтыя цэны і тарыфы, згодна з заканадаўствам, не могуць устанаўлівацца пагадненнем бакоў;

спрэчак аб прымусе заключыць дагавор, не заснаваны на нарматыўным акце.

**Артыкул 15. Гаспадарчыя спрэчкі, якія вырашаюцца Вышэйшым Гаспадарчым Судом Беларускай ССР**

Вышэйшы Гаспадарчы Суд Беларускай ССР вырашае:

спрэчкі, якія ўзнікаюць пры заключэнні, змяненні і скасаванні дагавораў і на іншых падставах паміж бакамі, якія знаходзяцца ў розных саюзных рэспубліках, калі іх разгляд аднесены да ведання гаспадарчых судоў Беларускай ССР;

спрэчкі, якія ўзнікаюць пры заключэнні, змяненні і скасаванні дагавораў, на суму звыш 5 млн. рублёў;

спрэчкі, якія ўзнікаюць пры выкананні дагавораў і на іншых падставах, калі цана іску звыш 30 тыс. рублёў;

іншыя спрэчкі, аднесеныя да ведання Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР заканадаўчымі актамі Беларускай ССР.

Вышэйшы Гаспадарчы Суд Беларускай ССР мае права ў межах падведамнасці спрэчак гаспадарчым судам Беларускай ССР прыняць да свайго вядзення справы і вырашыць любую спрэчку.

**Артыкул 16. Гаспадарчыя спрэчкі, якія вырашаюцца гаспадарчымі судамі абласцей**

Гаспадарчыя суды абласцей вырашаюць усе гаспадарчыя спрэчкі, акрамя спрэчак, аднесеных да ведання Вышэйшага арбітражнага суда СССР і Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР.

**Артыкул 17. Тэрытарыяльная падсуднасць гаспадарчых спрэчак**

Спрэчкі, якія ўзнікаюць пры заключэнні, змяненні і скасаванні гаспадарчых дагавораў, разглядаюцца гаспадарчым судом па месцы знаходжання пастаўшчыка або прадпрыемства (арганізацыі), што аказвае паслугі.

Спрэчкі, якія ўзнікаюць пры выкананні дагавораў і на іншых падставах, разглядаюцца па месцы знаходжання адказчыка.

Спрэчкі аб прызнанні несапраўднымі актаў дзяржаўных органаў, аб аспрэчванні дзяржаўнага заказу разглядаюцца гаспадарчым судом па месцы знаходжання дзяржаўнага органа, які выдаў акт.

Калі па справе ўдзельнічае некалькі адказчыкаў, спрэчка разглядаецца гаспадарчым судом па месцы знаходжання аднаго з адказчыкаў па выбары істца.

**Артыкул 18. Выключная падсуднасць гаспадарчых спрэчак**

Спрэчкі, якія ўзнікаюць з дагавораў перавозкі, у якіх адным з адказчыкаў з'яўляецца орган транспарту, разглядаюцца гаспадарчым судам па месцы знаходжання гэтага органа.

Спрэчкі аб прызнанні несапраўднымі актаў дзяржаўных органаў рэспубліканскага падпарадкавання разглядаюцца Вышэйшым Гаспадарчым Судам Беларускай ССР.

**Артыкул 19. Падача іскавых матэрыялаў па падсуднасці. Рознагалоссі па падсуднасці**

Пры выяўленні непадсуднасці справы гаспадарчы суд у пяцідзённы тэрмін накіроўвае іскавыя матэрыялы па падсуднасці.

Пры ўстанаўленні, што дадзеная спрэчка не падведамная гаспадарчаму суду, гаспадарчы суд вяртае іскавыя матэрыялы без разгляду.

Калі ў працэсе разгляду справы выяўлена непадсуднасць спрэчкі, гаспадарчы суд, які прыняў іскавую заяву, павінен разгледзець спрэчку па сутнасці.

Рознагалоссі па падсуднасці спрэчкі паміж гаспадарчымі судамі абласцей вырашае Вышэйшы Гаспадарчы Суд Беларускай ССР.

### ГЛАВА III. Удзельнікі разгляду гаспадарчых спрэчак

**Артыкул 20. Бакі, якія ўдзельнічаюць у разглядзе гаспадарчых спрэчак**

Бакамі ў спрэчках, якія разглядаюцца гаспадарчымі судамі ў Беларускай ССР,— істцамі і адказчыкамі — з'яўляюцца юрыдычныя асобы незалежна ад форм уласнасці.

Істцамі з'яўляюцца прадпрыемствы і арганізацыі, якія прад'явілі іск або ў інтарэсах якіх прад'яўлены іск або ўзбуджана справа па ініцыятыве гаспадарчага суда, а таксама якія аспрэчваюць акты іншага органа.

Адказчыкамі з'яўляюцца прадпрыемствы і арганізацыі, дзяржаўныя і іншыя органы, да якіх прад'яўлены іскавыя патрабаванні.

**Артыкул 21. Правы бакоў**

Кожны з бакоў карыстаецца пры вырашэнні гаспадарчай спрэчкі роўнымі правамі.

Бакі маюць права знаёміцца з матэрыяламі справы, рабіць выпіскі з іх, здымаць копіі, прадстаўляць доказы, прымаць удзел у аглядзе і даследаванні доказаў, даваць растлумачэнні, прыводзіць свае довады па ўсіх пытаннях, якія ўзнікаюць пры вырашэнні спрэчкі, пярэчыць супраць хадайніцтваў і довадаў іншых удзельнікаў працэсу, удзельнічаць у прыняцці рашэння, абскардзіць рашэнні, пастановы і вызначэнні гаспадарчага суда і ажыццяўляць іншыя працэсуальныя дзеянні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам.

Бакі маюць права да прыняцця рашэння па спрэчцы заявіць адвод суддзі і эксперту ў выпадках, калі, на іх думку, яны асабіста прама або ўскосна зацікаўлены ў заканчэнні справы. Адвод заяўляецца ў пісьмовай форме.

Пытанне аб адводзе суддзі вырашаецца старшынёй гаспадарчага суда або яго намеснікам, а аб адводзе эксперта — суддзёй (суддзямі), які разглядае спрэчку.

**Артыкул 22. Працэсуальныя правы і абавязкі бакоў**

Бакі абавязаны добрасумленна карыстацца працэсуальным правам, якое ім належыць.

Ісцец мае права да прыняцця рашэння па справе змяніць падставу або прадмет іску, павялічыць размер іскавых патрабаванняў пры ўмове захавання парадку непасрэднага ўрэгулявання спрэчкі ў гэтай частцы.

Ісцец мае права адмовіцца ад іску або паменшыць размер іскавых патрабаванняў.

Адказчык мае права прызнаць іск поўнасцю або часткова.

Бакі могуць закончыць справу міравым пагадненнем.

Гаспадарчы суд не прымае адмовы істца ад іску, прызнання іску адказчыкам і не зацвярджае міравога пагаднення бакоў, калі гэтыя дзеянні супярэчаць закону або парушаюць чые-небудзь правы і інтарэсы, якія ахоўваюцца законам.

Гаспадарчы суд мае права змяніць па сваёй ініцыятыве падставу і прадмет іску.

У выпадку ліквідацыі або рэарганізацыі аднаго з бакоў суд дапускае замену гэтага боку яго правапераемнікам. Правапераемнасць магчыма ў любой стадыі працэсу.

**Артыкул 23. Прадстаўнікі бакоў**

Прадстаўнікамі бакоў у гаспадарчым судзе з'яўляюцца кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый. Паўнамоцтвы ўказаных асоб пацвярджаюцца дакументамі, якія сведчаць аб іх службовым становішчы.

Прадстаўнікамі бакоў могуць быць таксама іншыя асобы, паўнамоцтвы якіх пацвярджаюцца належна афармленай даверанасцю прадпрыемства, арганізацыі.

**Артыкул 24. Удзел у справе некалькіх істцоў і адказчыкаў**

Іск можа быць прад'яўлены некалькімі істцамі і да некалькіх адказчыкаў. Кожны з істцоў або адказчыкаў у адносінах да другога боку выступае ў працэсе самастойна.

**Артыкул 25. Прыцягненне да ўдзелу ў справе іншага істца, адказчыка**

Гаспадарчы суд пры наяўнасці дастатковых падстаў мае права да прыняцця рашэння па гаспадарчай спрэчцы па хадайніцтву боку або па сваёй ініцыятыве прыцягнуць да ўдзелу ў справе іншага істца, адказчыка.

Хадайніцтва боку аб прыцягненні да справы істца або адказчыка можа быць задаволена пры ўмове прыняцця бакамі мер да непасрэднага ўрэгулявання спрэчкі ва ўстаноўленым парадку.

Пры прыцягненні гэтых асоб па ініцыятыве гаспадарчага суда парадак непасрэднага ўрэгулявання спрэчкі не патрабуецца. Аб прыцягненні істца або адказчыка да ўдзелу ў справе выносіцца вызначэнне.

**Артыкул 26. Удзел у працэсе трэціх асоб**

Трэція асобы, якія заяўляюць самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі, могуць уступіць у справу да вынясення рашэння гаспадарчым судом, падаўшы іск да аднаго або абодвух бакоў. Яны карыстаюцца ўсімі правамі і нясуць усе абавязкі істца.

Трэція асобы, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, могуць уступіць у справу на баку істца або адказчыка да вынясення гаспадарчым судом рашэння, калі рашэнне па справе можа паўплываць на іх правы або абавязкі ў адносінах да аднаго з бакоў. Яны могуць быць прыцягнуты да ўдзелу ў справе таксама па хадайніцтву бакоў, пракурора або па ініцыятыве гаспадарчага суда.

Трэція асобы карыстаюцца працэсуальнымі правамі і нясуць працэсуальныя абавязкі боку.

**Артыкул 27. Удзел у працэсе пракурора**

Пракурор прымае ўдзел у працэсе ў выпадках накіравання ім заявы ў гаспадарчы суд у інтарэсах прадпрыемства або арганізацыі і прынясення пратэсту на рашэнне гаспадарчага суда. Пракурор, які ўдзельнічае ў працэсе, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, заяўляць адвод эксперту, прадстаўляць доказы, удзельнічаць у аглядзе і даследаванні доказаў, заяўляць хадайніцтвы, даваць растлумачэнні па справе. Адмова пракурора ад іску, памяншэнне размеру іскавых патрабаванняў, змяненне падстаў або прадмета іску не пазбаўляе права істца, у інтарэсах якога прад'яўлены іск, падтрымліваць іскавыя патрабаванні.

**Артыкул 28. Удзел у працэсе службовых асоб бакоў, іншых прадпрыемстваў і арганізацый, эксперта**

У працэсе могуць удзельнічаць службовыя і іншыя асобы бакоў і іншых прадпрыемстваў і арганізацый, калі яны выкліканы для дачы тлумачэнняў па сутнасці гаспадарчай спрэчкі. Указаныя асобы абавязаны з'яўляцца ў гаспадарчы суд па яго выкліку, паведамляць вядомыя ім звесткі і абставіны па справе, прадстаўляць па патрабаванню суда тлумачэнні ў пісьмовым выглядзе.

У працэсе могуць удзельнічаць эксперты, якія праводзілі экспертызу.

**Артыкул 29. Удзел прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў і працоўных калектываў у разглядзе спрэчак**

Да ўдзелу ў разглядзе спрэчкі гаспадарчым судом дапускаюцца прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і працоўных калектываў прадпрыемстваў і арганізацый, якія з'яўляюцца бакамі па справе, для выкладання гаспадарчаму суду думкі аб'яднанняў і калектываў, што іх упаўнаважылі, наконт разглядаемай спрэчкі.

Паўнамоцтвы прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў і працоўных калектываў засведчваюцца выпіскай з рашэння, прынятага выбарным органам грамадскага аб'яднання або працоўнага калектыву.

### ГЛАВА IV. Доказы

**Артыкул 30. Паняцце і віды доказаў**

Доказам па справе з'яўляюцца любыя фактычныя даныя, на аснове якіх гаспадарчы суд у вызначаным законам парадку ўстанаўлівае наяўнасць або адсутнасць абставін, якія абгрунтоўваюць патрабаванні і пярэчанні бакоў, а таксама іншыя абставіны, што маюць значэнне для правільнага вырашэння гаспадарчай спрэчкі.

Гэтыя даныя ўстанаўліваюцца пісьмовымі і рэчавымі доказамі, тлумачэннямі прадстаўнікоў бакоў і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у працэсе, а таксама заключэннямі экспертаў.

**Артыкул 31. Абавязковасць доказвання і прадстаўлення доказаў**

Кожны бок павінен даказаць тыя абставіны, на якія ён спасылаецца як на падставу сваіх патрабаванняў і пярэчанняў.

Доказы прадстаўляюцца бакамі і іншымі ўдзельнікамі працэсу.

**Артыкул 32. Аднесенасць і допушчальнасць доказаў**

Гаспадарчы суд прымае толькі тыя доказы, якія маюць значэнне для справы.

Абставіны справы, якія, згодна з заканадаўствам, павінны быць пацверджаны пэўнымі сродкамі доказу, павінны пацвярджацца гэтымі сродкамі.

**Артыкул 33. Падставы вызвалення ад даказвання**

Абставіны, прызнаныя гаспадарчым судом агульнавядомымі, не маюць патрэбы ў даказванні.

Факты, устаноўленыя рашэннем гаспадарчага суда пры вырашэнні гаспадарчай спрэчкі, не даказваюцца зноў пры вырашэнні іншых спрэчак, у якіх удзельнічаюць тыя ж бакі.

Прыгавор суда па крымінальнай справе, які ўступіў у законную сілу, абавязковы для гаспадарчага суда, які вырашае спрэчку, па пытаннях, ці мелі месца пэўныя дзеянні і кім яны ўчынены.

Рашэнне суда па грамадзянскай справе, якое ўступіла ў законную сілу, абавязковае для гаспадарчага суда, які вырашае спрэчку, па пытаннях аб фактах, што ўстаноўлены судом і маюць значэнне для справы.

**Артыкул 34. Пісьмовыя доказы**

Пісьмовымі доказамі з'яўляюцца акты, пісьмы, тлумачэнні, звесткі, заключэнні, іншыя дакументы і матэрыялы, якія змяшчаюць даныя аб абставінах, што маюць значэнне для правільнага вырашэння гаспадарчай спрэчкі.

Пісьмовыя доказы прадстаўляюцца ў арыгінале або ў належным чынам заверанай копіі. Калі для вырашэння спрэчкі мае значэнне толькі частка дакумента, прадстаўляецца належным чынам завераная выпіска з яго.

Сапраўдныя дакументы прадстаўляюцца, калі абставіны справы, згодна з заканадаўствам, павінны быць засведчаны толькі такімі дакументамі, а таксама ў іншых неабходных выпадках па патрабаванню гаспадарчага суда.

**Артыкул 35. Рэчавыя доказы**

Рэчавымі доказамі з'яўляюцца прадметы, якія могуць служыць сродкамі ўстанаўлення абставін, што маюць значэнне для правільнага вырашэння гаспадарчай спрэчкі.

**Артыкул 36. Запатрабаванне доказаў**

Суддзя мае права патрабаваць ад усіх прадпрыемстваў і арганізацый прадстаўлення дакументаў, звестак і заключэнняў, неабходных для вырашэння справы, знаёміцца з такімі матэрыяламі непасрэдна ў месцы іх знаходжання.

Бок, пракурор, якія хадайнічаюць аб запатрабаванні доказаў, абавязаны ўказаць, якія абставіны, што маюць значэнне для справы, могуць быць устаноўлены гэтымі доказамі.

Суддзя можа ўпаўнаважыць бок на атрыманне такіх доказаў ад усіх прадпрыемстваў і арганізацый.

**Артыкул 37. Агляд і даследаванне пісьмовых і рэчавых доказаў у месцы іх знаходжання**

Суддзя можа правесці агляд і даследаванне пісьмовых і рэчавых доказаў у месцы іх знаходжання ў выпадку перашкод у прадастаўленні гэтых доказаў у суд.

Па выніках агляду і даследавання доказаў складаецца пратакол, што падпісваецца суддзёй і асобамі, якія ўдзельнічалі ў аглядзе і даследаванні доказаў. Пратакол далучаецца да справы.

**Артыкул 38. Вяртанне пісьмовых і рэчавых доказаў**

Сапраўдныя дакументы, якія ёсць у справе, па просьбе прадпрыемстваў і арганізацый вяртаюцца ім пасля вырашэння спрэчкі па заканчэнні тэрміну на абскарджанне.

Рэчавыя доказы, якія знаходзяцца ў гаспадарчым судзе, пасля вырашэння спрэчкі вяртаюцца прадпрыемствам і арганізацыям, ад якіх яны былі атрыманы, або перадаюцца прадпрыемствам і арганізацыям, за якімі гаспадарчы суд прызнаў права на гэтыя рэчы.

**Артыкул 39. Назначэнне і правядзенне экспертызы**

Для растлумачэння пытанняў, якія ўзнікаюць пры вырашэнні гаспадарчай спрэчкі і патрабуюць спецыяльных ведаў, гаспадарчы суд назначае экспертызу.

Удзельнікі працэсу маюць права паставіць гаспадарчаму суду пытанні, якія павінны быць растлумачаны экспертам.

Правядзенне экспертызы павінна даручацца кампетэнтным прадпрыемствам і арганізацыям і толькі пры адсутнасці такой магчымасці — непасрэдна спецыялістам, якія валодаюць неабходнымі для гэтага ведамі. Асобы, якія праводзяць экспертызу, маюць права знаёміцца з матэрыяламі справы і запытваць ад удзельнікаў працэсу дадатковыя матэрыялы. У выпадку неабходнасці экспертыза праводзіцца з удзелам прадстаўнікоў бакоў.

**Артыкул 40. Заключэнне эксперта**

Заключэнне эксперта павінна змяшчаць падрабязнае апісанне праведзеных даследаванняў, зробленыя па іх выніках вывады і абгрунтаваныя адказы на пастаўленыя гаспадарчым судом пытанні. Заключэнне прадстаўляецца гаспадарчаму суду ў пісьмовым выглядзе і ў копіі накіроўваецца бакам.

Калі пры правядзенні экспертызы ўстанаўліваюцца абставіны, што маюць значэнне для правільнага вырашэння гаспадарчай спрэчкі, наконт якіх гаспадарчым судом не былі пастаўлены пытанні, у заключэнні эксперт выкладае вывады і па гэтых абставінах.

У выпадках недастатковай зразумеласці і непаўнаты заключэння эксперта гаспадарчы суд можа назначыць дадатковую экспертызу Пры нязгодзе з заключэннем эксперта гаспадарчы суд можа назначыць паўторную экспертызу.

**Артыкул 41. Ацэнка доказаў**

Гаспадарчы суд ацэньвае ўсе доказы па свайму ўнутранаму перакананню, заснаванаму на ўсебаковым, поўным і аб'ектыўным даследаванні ўсіх абставін справы, кіруючыся пры гэтым заканадаўствам.

Ніякія доказы не маюць для гаспадарчага суда загадзя ўстаноўленай сілы.

Прызнанне адным бокам фактычных даных і абставін, на якіх другі бок засноўвае свае патрабаванні або пярэчанні, для гаспадарчага суда не з'яўляецца абавязковым.

Заключэнне эксперта абмяркоўваецца гаспадарчым судом у пасяджэнні і ацэньваецца ў сукупнасці з усімі іншымі доказамі па справе.

Заключэнне эксперта можа быць адхілена гаспадарчым судом з указаннем у рашэнні матываў адхілення.

### ГЛАВА V. Судовыя расходы

**Артыкул 42. Састаў судовых расходаў**

Расходы па вядзенню справы складаюцца з дзяржаўнай пошліны і сум, якія падлягаюць выплаце за правядзенне экспертызы, назначанай гаспадарчым судом.

**Артыкул 43. Дзяржаўная пошліна**

Іскавыя заявы і скаргі аб пераглядзе рашэнняў гаспадарчага суда аплачваюцца дзяржаўнай пошлінай у рэспубліканскі бюджэт у межах і размеры, устаноўленых заканадаўствам.

Па справах аб спагнанні грашовых сродкаў у замежнай валюце дзяржаўная пошліна аплачваецца ў савецкіх рублях.

Дзяржаўная пошліна вылічваецца з цаны іску або ў цвёрдай грашовай суме.

Пры павелічэнні іскавых патрабаванняў сума дзяржаўнай пошліны, якой нестае, спаганяецца ў адпаведнасці з павялічанай сумай іску. Пры памяншэнні цаны іску ўплачаная дзяржаўная пошліна не вяртаецца.

**Артыкул 44. Вызваленне ад платы дзяржаўнай пошліны**

Заканадаўствам Саюза ССР і Беларускай ССР устанаўліваюцца выпадкі вызвалення істцоў ад платы дзяржаўнай пошліны.

**Артыкул 45. Вяртанне дзяржаўнай пошліны**

Дзяржаўная пошліна падлягае вяртанню ў выпадках, устаноўленых заканадаўствам.

У рашэнні, вызначэнні, пастанове або ў даведцы гаспадарчага суда ўказваюцца абставіны, якія з'яўляюцца падставай для поўнага або частковага вяртання дзяржаўнай пошліны.

**Артыкул 46. Вызначэнне размеру сум, якія падлягаюць выплаце за правядзенне экспертызы**

Расходы па экспертызе, калі яна праводзіцца за ўзнагароджанне, вызначаюцца гаспадарчым судом у рашэнні з улікам устаноўленых у належным парадку ставак аплаты і затрачанага часу. Экспертам вяртаюцца расходы па праезду, найму жылога памяшкання і сутачныя ў размерах, устаноўленых заканадаўствам аб камандзіроўках.

**Артыкул 47. Размеркаванне паміж бакамі расходаў па вядзенню справы**

Расходы па дзяржаўнай пошліне адносяцца:

па спрэчках, што ўзнікаюць пры заключэнні, змяненні і скасаванні дагавора,— на бок, які неабгрунтавана ўхіляецца ад прыняцця прапаноў другога боку, або на два бакі, калі гаспадарчым судом адхілена частка прапаноў кожнага з бакоў;

па спрэчках, якія ўзнікаюць пры выкананні дагавораў і на іншых падставах, — на бакі прапарцыянальна задаволеных іскавых патрабаванняў.

Калі справа ўзнікла з прычыны няправільных дзеянняў боку, гаспадарчы суд мае права аднесці на яго расходы па дзяржаўнай пошліне незалежна ад заканчэння справы.

Дзяржаўная пошліна, ад платы якой ісцец быў вызвалены ва ўстаноўленым парадку, спаганяецца з адказчыка ў даход бюджэту прапарцыянальна размеру задаволеных іскавых патрабаванняў.

Боку, у карысць якога адбылося рашэнне, гаспадарчы суд пакрывае расходы па плаце дзяржаўнай пошліны за кошт другога боку, хоць гэты бок і быў вызвалены ад платы пошліны.

Сумы, якія падлягаюць выплаце за правядзенне экспертызы, адносяцца:

пры задавальненні іску — на адказчыка;

пры адмове ў іску — на істца;

пры частковым задавальненні іску — на абодва бакі прапарцыянальна размеру задаволеных іскавых патрабаванняў.

### ГЛАВА VI. Працэсуальныя тэрміны

**Артыкул 48. Устанаўленне і вылічэнне працэсуальных тэрмінаў**

Працэсуальныя дзеянні праводзяцца ў тэрміны, устаноўленыя законам. У выпадках, калі працэсуальныя тэрміны не ўстаноўлены законам, яны назначаюцца гаспадарчым судом.

Тэрміны для правядзення працэсуальных дзеянняў вызначаюцца дакладнай каляндарнай датай, указаннем на падзею, якая абавязкова павінна наступіць, або перыядам часу. У апошнім выпадку дзеянне можа быць праведзена на працягу ўсяго перыяду.

Ход працэсуальнага тэрміну, які вылічаецца гадамі, месяцамі ці днямі, пачынаецца на наступны дзень пасля каляндарнай даты ці надыходу падзеі, якой вызначаны яго пачатак.

**Артыкул 49. Заканчэнне працэсуальных тэрмінаў**

Тэрмін, які вылічаецца гадамі, заканчваецца ў адпаведны месяц і дату апошняга года тэрміну.

Тэрмін, які вылічваецца месяцамі, заканчваецца ў адпаведны месяц і дату апошняга месяца тэрміну. Калі канец тэрміну, што вылічаецца месяцамі, прыпадае на такі месяц, які адпаведнай даты не мае, то тэрмін заканчваецца ў апошні дзень гэтага месяца.

У выпадках, калі апошні дзень тэрміну прыпадае на нерабочы дзень, днём заканчэння тэрміну лічыцца першы наступны за ім рабочы дзень.

Працэсуальнае дзеянне, для правядзення якога ўстаноўлены тэрмін, можа быць выканана да 24 гадзін апошняга дня тэрміну.

**Артыкул 50. Прыпыненне, аднаўленне і прадаўжэнне працэсуальных тэрмінаў**

Ход усіх незаконченых працэсуальных тэрмінаў прыпыняецца з прыпыненнем вядзення справы. З дня аднаўлення вядзення справы ход працэсуальных тэрмінаў аднаўляецца.

Гаспадарчы суд, прызнаўшы прычыны пропуску ўстаноўленага законам працэсуальнага тэрміну ўважлівымі, можа аднавіць прапушчаны тэрмін.

Аб аднаўленні прапушчанага тэрміну ўказваецца ў рашэнні, вызначэнні ці пастанове гаспадарчага суда. Аб адмове ў аднаўленні тэрміну выносіцца вызначэнне.

Назначаныя гаспадарчым судом тэрміны могуць быць ім прадоўжаны па заяве боку, пракурора або па сваёй ініцыятыве.

### ГЛАВА VII. Парадак і тэрміны ўрэгулявання бакамі гаспадарчых спрэчак

**Артыкул 51. Парадак прад'яўлення прэтэнзій**

Прадпрыемствы, арганізацыі, маёмасныя правы і законныя інтарэсы якіх парушаны, маюць права прад'явіць прэтэнзію да прадпрыемстваў, арганізацый, якія парушылі гэтыя правы і інтарэсы.

Прэтэнзія прад'яўляецца ў пісьмовай форме, у ёй указваецца:

назва прадпрыемства, арганізацыі, якія прад'явілі прэтэнзію, і прадпрыемства, арганізацыі, да якіх прад'яўлена прэтэнзія;

дата прад'яўлення і нумар прэтэнзіі;

абставіны, якія з'яўляюцца падставай для прад'яўлення прэтэнзіі; доказы, што пацвярджаюць гэтыя абставіны;

патрабаванні заяўніка;

сума прэтэнзіі і яе разлік, на які разліковы рахунак яна павінна быць пералічана;

пералік прыкладзеных да прэтэнзіі дакументаў.

Прэтэнзія падпісваецца кіраўніком.

Прэтэнзія адпраўляецца заказным ці каштоўным пісьмом або ўручаецца пад распіску.

Парадак і тэрміны прад'яўлення прэтэнзіі да транспартных арганізацый устанаўліваюцца транспартным заканадаўствам.

**Артыкул 52. Парадак і тэрміны разгляду прэтэнзій**

Прадпрыемствы, арганізацыі, да якіх прад'яўлена прэтэнзія, абавязаны ў месячны тэрмін даць на яе адказ. Адказ на прэтэнзію падпісваецца кіраўніком.

Адказ на прэтэнзію адпраўляецца заказным ці каштоўным пісьмом або ўручаецца пад распіску.

У выпадку парушэння месячнага тэрміну разгляду прэтэнзіі ці пакідання яе без адказу гаспадарчы суд пры разглядзе гаспадарчай спрэчкі мае права спагнаць у даход рэспубліканскага бюджэту з арганізацыі, прадпрыемства, якія дапусцілі парушэнне, два працэнты сумы іску, але не менш 100 рублёў і не звыш 1000 рублёў.

Пры поўным або частковым прызнанні прэтэнзіі прадпрыемства, арганізацыя ў добраахвотным парадку пералічваюць заяўніку прызнаную суму.

У выпадку непералічэння прызнанай сумы заяўнік па заканчэнні 20 дзён пасля атрымання адказу мае права прад'явіць у адпаведны банк распараджэнне на спісанне ў бясспрэчным парадку прызнанай даўжніком сумы. Бясспрэчнае спісанне грашовых сум у гэтым выпадку праводзіцца з усіх даўжнікоў, у тым ліку і з кааператываў і арэндных прадпрыемстваў.

Спісанне грашовых сум праводзіцца ва ўстаноўленым парадку.

**Артыкул 53. Урэгуляванне рознагалоссяў, якія ўзнікаюць пры заключэнні, змяненні і скасаванні гаспадарчых дагавораў**

Рознагалоссі, якія ўзнікаюць паміж прадпрыемствамі і арганізацыямі пры заключэнні, змяненні і скасаванні гаспадарчых дагавораў, разглядаюцца кіраўнікамі прадпрыемстваў, арганізацый у 10-дзённы тэрмін з дня паступлення праекта дагавора, прапановы аб змяненні або скасаванні дагавора.

Пры прыняцці ўмоў дагавора яго праект падпісваецца і другі экземпляр дагавора накіроўваецца боку, які выслаў праект дагавора. Аб прызнанні прапановы аб змяненні або скасаванні дагавора другому боку накіроўваецца пісьмо.

Пры наяўнасці пярэчанняў па ўмовах дагавора прадпрыемствы, арганізацыі, якія атрымалі праект дагавора, складаюць праект пратакола рознагалоссяў, аб чым робяць агаворку ў дагаворы, і ў 10-дзённы тэрмін накіроўваюць другому боку пратакол рознагалоссяў.

Прадпрыемствы, арганізацыі, якія атрымалі пратакол рознагалоссяў, абавязаны ў 20-дзённы тэрмін разгледзець яго з бокам па дагавору і ў гэты ж тэрмін накіраваць неўрэгуляваныя пытанні на разгляд гаспадарчага суда.

У выпадку неперадачы спрэчных пытанняў на разгляд гаспадарчага суда ў гэты тэрмін дагавор лічыцца заключаным у рэдакцыі пратакола рознагалоссяў.

Пры неатрыманні адказу на прапанову аб змяненні або скасаванні дагавора або атрыманні адмоўнага адказу зацікаўлены бок у 20-дзённы тэрмін мае права звярнуцца ў гаспадрачы суд.

### ГЛАВА VIII. Узбуджэнне вядзення справы

**Артыкул 54. Прыняцце мер да непасрэднага ўрэгулявання гаспадрачых спрэчак**

Спрэчка можа быць перададзена на вырашэнне гаспадарчага суда толькі пасля прыняцця бакамі мер да непасрэднага ўрэгулявання яе ў парадку, устаноўленым главой VII гэтага Кодэкса.

Узбуджэнне спраў па заяве пракурора або па ініцыятыве гаспадарчага суда праводзіцца незалежна ад захавання бакамі парадку непасрэднага ўрэгулявання спрэчкі.

**Артыкул 55. Форма і змест іскавай заявы**

Іскавая заява падаецца ў гаспадарчы суд у пісьмовай форме і падпісваецца кіраўніком прадпрыемства, арганізацыі або пракурорам, які накіроўвае заяву.

У іскавай заяве павінны быць указаны:

назва бакоў, іх паштовыя адрасы;

цана іску, калі іск падлягае ацэнцы;

абставіны, на якіх грунтуецца іскавае патрабаванне, і доказы, што пацвярджаюць выкладзеныя ў заяве абставіны, абгрунтаваны разлік сумы, якая спаганяецца або аспрэчваецца, закон або нарматыўны акт, на падставе якога прад'яўляецца іск;

звесткі аб прыняцці мер да непасрэднага ўрэгулявання гаспадарчай спрэчкі;

іскавае патрабаванне, а калі іск прад'яўлены да некалькіх адказчыкаў, — патрабаванне ў адносінах да кожнага з іх;

пералік дакументаў, якія прыкладаюцца да заявы, і іншых доказаў.

У іскавай заяве могуць быць указаны і іншыя звесткі, калі заяўнік лічыць, што яны неабходныя для правільнага вырашэння спрэчкі.

**Артыкул 56. Цана іску**

Цана іску вызначаецца заяўнікам, зыходзячы з сумы, якая спаганяецца, або з сумы, якая аспрэчваецца па выканаўчаму дакументу або іншаму дакументу, па якому спагнанне праводзіцца ў бясспрэчным (безакцэптным) парадку. Цана іску па справах аб запатрабаванні маёмасці вызначаецца, зыходзячы з кошту гэтай маёмасці. У цану іску ўключаюцца таксама ўказаныя ў іскавай заяве сумы няўстойкі (штрафу, пені), а калі яны не ўказаны,— сумы іх, вызначаныя ў рашэнні гаспадарчага суда.

У выпадках няправільнага ўказання заяўнікам цаны іску або ўзбуджэння справы па ініцыятыве гаспадарчага суда цана іску вызначаецца гаспадарчым судом.

Цана іску, якая складаецца з некалькіх самастойных патрабаванняў, вызначаецца сумай усіх патрабаванняў.

Цана іску, прад'ўленага ў замежнай валюце, вылічаецца па афіцыяльнаму курсу Дзяржаўнага банка СССР, які дзейнічае на дзень прад'яўлення іску.

**Артыкул 57. Дакументы, якія прыкладаюцца да іскавай заявы**

Да іскавай заявы прыкладаюцца дакументы, якія пацвярджаюць:

абставіны, на якіх асноўваецца іскавае патрабаванне;

прыняцце мер да непасрэднага ўрэгулявання спрэчкі з кожным з адказчыкаў;

накіраванне адказчыку копіі іскавай заявы і прыкладзеных да яе дакументаў;

уплату дзяржаўнай пошліны ва ўстаноўленым парадку і размеры.

Да заявы аб прызнанні акта несапраўдным прыкладаецца таксама копія акта, які аспрэчваецца, або завераная выпіска з яго.

**Артыкул 58. Накіраванне копіі іскавай заявы і прыкладаемых да яе дакументаў**

Заяўнік абавязан пры прад'яўленні іска, а таксама пры прыцягненні гаспадарчым судом да справы іншага істца або адказчыка накіраваць бакам копіі іскавай заявы і прыкладзеных да яе дакументаў, калі яны ў іх адсутнічаюць.

**Артыкул 59. Спалучэнне іскавых патрабаванняў**

У адной іскавай заяве могуць быць спалучаны некалькі патрабаванняў у выпадках, калі яны звязаны паміж сабой на падставах узнікнення або прадстаўленых доказах.

Суддзя мае права аб'яднаць некалькі аднародных іскавых заяў або спраў, у якіх удзельнічаюць адны і тыя ж бакі, у адну справу, аб чым указваецца ў вызначэнні аб узбуджэнні справы або ў рашэнні.

**Артыкул 60. Водзыў на іскавую заяву**

Адказчык, які атрымаў вызначэнне гаспадарчага суда аб узбуджэнні справы, мае права накіраваць суду і іншым удзельнікам працэсу водзыў на іскавую заяву да дня слухання справы.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Народная газета

# Зарубежье

ТАСС ● ИАН ● Инфоновости ● «Народная газета»

## С миру по нитке...

ДЕЛИ.

Ежегодно самые бедные страны Азии, Африки и Латинской Америки получают в виде безвозмездной помощи и льготных кредитов 45—60 млрд. долларов, но положение у них от этого реально не улучшается. Об этом пишет распространяемый в индийской столице Всемирной организацией здравоохранения (ВОЗ) журнал «Международная помощь и развитие». Как указывает журнал, пора разобраться с этим и наладить, наконец, такую систему, которая была бы нацелена на решение насущных проблем стран «третьего мира».

Один из серьезных пороков нынешней системы вспомоществования—отсутствие контроля за распределением отпущенных средств. По мнению журнала, в рамках программ нередко осуществляется перекачка ресурсов от международных финансовых институтов частным корпорациям Запада. Именно они остаются крупнейшими продавцами разного рода товаров и технологий, на которые идут предоставленные международными организациями средства. Причем далеко не всегда закупаемые товары—самые нужные.

Настоящей «черной дырой», в которую без счета утекают средства, предназначенные на борьбу с голодом, нищетой, болезнями, становится сама не слишком эффективная деятельность международных финансовых институтов. В некоторых из них, по данным журнала, расходы на зарплату сотрудникам, на представительские и иные «нужды» достигают 80 проц. всех затрат. В Сомали, например, сотрудник ООН получает 55 тыс. долларов в год плюс оплаченный шестинедельный отпуск. По официальным данным, это в 50 раз больше, чем получает министр.

## Шампанское для музыкантов и...

ПАРИЖ.

Известный французский Дом шампанских вин «Леклерк-Британ» (г. Эперне) представил на прошедшем в г. Бордо всемирном салоне вин и спиртных напитков «Винэкспо-91» шампанское урожая 1983 года, которому глава фирмы Паскаль Леклерк-Британ в честь года Моцарта и двухсотлетия со дня смерти великого композитора дал название «Вольфганг Моцарт». Говорят, Моцарт был большим ценителем шампанских вин.

Само по себе великолепного качества, это шампанское сразу же вызвало горячий интерес коллекционеров этикеток. Дело в том, что бутылки вина «Вольфганг Моцарт» снабжены оригинальной этикеткой, изготовленной художником из Шампани Роланом Иролла. На левой ее части изображен профиль композитора и даты его жизни, а на правой — воспроизведение оригинальных нот «Волшебной флейты» Моцарта. Дата премьеры этой оперы в Вене (30 сентября 1791 года), флейта и узкий бокал для шампанского, который по-французски также называется «флейтой».

## О женщинах языком статистики

НЬЮ-ЙОРК.

Здесь опубликованы исследования «Женщины мира: тенденции и статистика 1970—1990». Это первая попытка экспертов ООН оценить положение и общественный статус женщин в 178 странах. Согласно исследованиям, за равный труд с мужчинами женщины зарабатывают в среднем на 30—40 процентов меньше, получают менее престижную работу, число неграмотных женщин возросло с 543 миллионов в 1970 году до 597 миллионов в 1985 году.

Продолжительность жизни женщин в настоящее время повсеместно превышает этот показатель у мужчин: на 6,5 лет в среднем в развитых странах, на 4 года в Африке, где женщины живут 54 года против 75 лет в Европе и Северной Америке. При этом может вызвать удивление тот факт, что женщин на земле проживает меньше: 2,63 млрд. (от общего населения в 5,3 млрд.).

Советский Союз фигурирует в исследовании как страна с постоянно возрастающей экономической активностью женщин и с наиболее высоким уровнем участия женщин в трудовой деятельности.

## ФОТОГЛОБУС



ЮАР. Марк и Джоанн, молодые южноафриканцы, отправились под венец на асфальтоукладывающей машине, любезно предоставленной им отцом невесты.

## НАТО: победит ли новое мышление?

**(Интервью бывшего начальника Штаба Объединенных вооруженных сил стран—участниц Варшавского Договора генерала армии Владимира ЛОБОВА).**

**Впервые участие в сессии Североатлантической ассамблеи в качестве «ассоциированных делегатов» приняли представители Верховного Совета СССР. В их числе — генерал армии Владимир ЛОБОВ.**

**— Как Вы оцениваете участие советских парламентариев в работе сессии Североатлантической ассамблеи?**

— Общеевропейский дом не может быть построен без тесных контактов на парламентском уровне. Их необходимо развивать и укреплять. За ними — будущее. Сейчас мы имели возможность присутствовать на всех заседаниях комитетов и пленарных заседаниях Североатлантической ассамблеи. И не только присутствовать, но и высказывать свои соображения — опасения, критику. К выступлениям членов советской делегации внимательно прислушивались, поскольку, как мне кажется, они представляли значительный интерес для парламентариев Североатлантической ассамблеи.

**— На протяжении всего своего существования деятельность НАТО была направлена в основном на создание «противовеса» Варшавскому Договору. Теперь его нет. Произошли и существенные изменения в военной политике СССР. Изменилась ли политика НАТО?**

— Новое политическое мышление и советская внешняя политика приносят позитивные результаты. В политической жизни уже нет той конфронтации, которая существовала между НАТО и ОВД. И хотя прослеживается тенденция сохранения блока НАТО, уже ставится на повестку дня вопрос сокращения американского военного присутствия в Европе до 80 тысяч военнослужащих. Будет уменьшена также численность войск Великобритании, Бельгии, Канады и других стран, дислоцированных в ФРГ. Пересматриваются в сторону уменьшения военные бюджеты стран — участниц НАТО. Разрабатывается иная концепция военной стратегии. Все это свидетельствует о том, что НАТО, как военная организация, находится в процессе поиска новых структур, соответствующих меняющемуся миру.

Я посчитал необходимым выступить и высказать свою точку зрения по одному из вопросов. Если раньше Европу разделяли, беря за основу принадлежность к НАТО или ОВД, на Восточную и Западную, то теперь предлагается деление на Восточную, Центральную, Западную, Южную и Северную. По моему мнению, Европа должна быть единой от Атлантики до Урала. И именно на этой основе должно идти развитие общеевропейских отношений, а не на основе разделения на зоны. Этой же точки зрения придерживаются представители Франции и некоторых других стран.

**— Как Вы можете прокомментировать появившиеся в печати сообщения о намерении существенно понизить уровень боевого потенциала НАТО?**

— В настоящее время действительно пересматривается структура вооруженных сил НАТО, которые состоят из сил непосредственного реагирования, сил быстрого развертывания, формирующихся в настоящее время только на период учений, и сил стратегического резерва. Но одновременно с пересмотром структуры укрепляются национальные и межнациональные силы в Европе — создаются многонациональные соединения. Предлагается постоянно иметь силы быстрого развертывания для того, чтобы мгновенно реагировать на изменения обстановки в той или иной европейской точке.

Однако, несмотря на осуществление реконструкции при сохранении вооруженных сил НАТО, вряд ли возможно отказаться от блокового мышления. И соответственно будет сохраняться военная напряженность. При этом, по моему мнению, необходимо учитывать, что НАТО — организация, обладающая многонациональными силами быстрого развертывания, не столько политическая, сколько военная. В настоящее время Организация Варшавского Договора прекратила свое существование и у Североатлантического союза нет противника, который бы оправдывал военную деятельность. Невольно возникает вопрос: от кого намерен НАТО защищать Европу? Приводятся различные доводы: блок необходим для стабилизации обстановки в странах-участницах и других государствах Европы; упоминается Персидский залив и то, что в Советском Союзе существует определенная нестабильность. Все это позволяет сделать вывод, что старая идея сохранения НАТО все еще жива. По сути дела, Североатлантическая ассамблея разделилась на два лагеря. США, Великобритания и в какой-то мере Голландия настаивают на сохранении НАТО и Североатлантической ассамблеи. Франция, ФРГ и некоторые другие страны выступают за развитие процессов СБСЕ, укрепление структуры общеевропейской безопасности.

**— Порой создается впечатление, что НАТО пытается навязать свой сценарий процессу СБСЕ...**

— Получается, что так. На ассамблее высказывалась мысль, что СБСЕ должно стать придатком НАТО, посредством которого возможно поддержание связей с Советским Союзом, а сохранение Североатлантического союза необходимо для поддержания тесных связей с США. На мой взгляд, некоторые парламентарии не могут отойти от канонов старого мышления. Но будущее все-таки за СБСЕ с обязательным участием США и Канады.

Валерий БОРИСЕНКО.

Адкрыты ліст

# Памяць пра песняра абавязвае...

**СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР ТАВАРЫШУ ДЗЕМЯНЦЕЮ М. І.**

Паважаны Мікалай Іванавіч!

Звярнуцца да Вас з гэтым лістом нас змушаюць вось якія абставіны. Як вядома, паводле пастановы Савета Народных Камісараў «Аб ушанаванні памяці народнага паэта Беларусі Янкі Купалы», якая была прынята адразу ж пасля трагічнай смерці паэта, у 1957 годзе ў Радашковічах быў устаноўлены помнік Янку Купалу. Аўтарамі яго былі браты Леў і Марк Роберманы. Сюды, да помніка, заўсёды прыходзілі ўдзячныя гараджане, прыносілі кветкі. Ды і ў самім скверы, дзе стаяў помнік, было ўтульна, дагледжана.

У 1982 годзе помнік быў па невядомых прычынах разбураны. Як ні дзіўна, але здарылася гэта напярэдадні стогадовага юбілею паэта. Нягледзячы на шматлікія просьбы гараджан, пратэсты творчай інтэлігенцыі, помнік да сённяшняга дня так і не адноўлены. А Радашковічы ж вельмі цесна звязаны з жыццём і творчасцю паэта. Непадалёку, у Вязынцы, ён нарадзіўся, тут яго хрысцілі, тут была яшчэ ў дарэвалюцыйны час пастаўлена яго несмяротная «Паўлінка», на прэм'еры якой прысутнічаў сам аўтар. Ды і жыў, працаваў паэт даволі доўга тут.

Помнік Янку Купалу ў Радашковічах павінен быць адноўлены. І чым хутчэй, тым лепш. З гэтым мы і звяртаемся да Вас як да Старшыні Вярхоўнага Савета БССР. Няхай гэта будзе Вашым практычным увасабленнем клапатлівых адносін да памяці паэта, помнікаў культуры беларускага народа.

**Серафім АНДРАЮК, Рыгор БАРАДУЛІН, Анатоль ВЯРЦІНСКІ, Сяргей ЗАКОННІКАЎ, Васіль ЗУЁНАК, Віктар КАЗЬКО, Максім ЛУЖАНІН, Барыс САЧАНКА, Кастусь ЦВІРКА, Іван ЧЫГРЫНАЎ.**

***

З падобнай заявай у рэдакцыю «Народнай газеты» звярнуліся 172 жыхары Радашковічаў.

Футбол

# НЕ МЫТЬЕМ, ТАК КАТАНЬЕМ

**Сомневающихся в выигрыше минским «Динамо» у новичка высшей лиги запорожского «Металлурга» в этот день, пожалуй, не было. Разговоры на трибунах в основном велись о том, с каким, естественно — победным, счетом закончится матч. Залогом этому служила довольно внушительная июньская победная серия минчан. Немалым раздражителем должен был стать и обиднейший проигрыш этой же команде в первом круге, причем после гола, пропущенного на последних секундах.**

Забегая вперед, сразу скажем, что победный результат 2:0 достигнут. Но тем не менее того удовлетворения от игры, какое получили болельщики в предыдущем матче с московскими динамовцами, нет. Но начнем по порядку.

Минчане начали матч тем же составом, что и предыдущий. Начали обстоятельно, сразу же устремившись к воротам соперников. Но тут же выяснилось, что запорожцы в предложенный футбол играть не хотят. Судя по всему, счет 1:4 на своем поле в предыдущем матче с одесским «Черноморцем» заставил их резко изменить тактику. Не мудрствуя лукаво игроки «Металлурга» стали в глубоко эшелонированную оборону. Минский вратарь Курбыко откровенно скучал. Правда, один раз кто-то из собственных игроков скуку ему прогнал, нечаянно «влепив» по своим воротам. Время от времени, упустив очередной голевой момент, наши футболисты хватались за голову. Такие сцены демонстрировали Сокол, Мархель, Жута. Угловой следовал за угловым, а гола не было. Уж сколько раз, как говорится, твердили миру спортивные обозреватели, что наша команда, столкнувшись с оборонительной тактикой соперников, не может найти себя. Почему? Объяснение одно: скудость тактического арсенала. Ведь сами как дома, так и на выезде, исповедуют игру от обороны, уповая на контратаки.

Счет был открыт при довольно курьезных обстоятельствах. Минут за пять до перерыва вратарь запорожцев Сивуха отдал мяч своему защитнику, а тот что есть силы ударил в поле и попал прямо в минского защитника Лухвича. Мяч рикошетом полетел по высокой дуге обратно к воротам. Дефилировавший по штрафной площадке Сивуха что есть силы стартовал к своему «рабочему месту». Но было поздно. Мяч уже юркнул под перекладину. Что ж, минчане добились своего, как говорится, не мытьем, так катаньем.

Эта народная мудрость вспомнилась и в самом начале второго тайма. Сокол довольно лихо промчался по левому краю и прострелил мяч в штрафную площадку. Великой опасности не было: партнеры отстали. Но тут вдруг в воздух взвился центральный защитник запорожцев и довольно красиво нанес точный удар головой по своим воротам. 2:0 в пользу минчан.

На табло в качестве автора гола высветили фамилию Сокола. Но вряд ли сделает это в своем протоколе судья. Футбол не бильярд: «свояки» здесь не считаются.

Через несколько минут запорожцы остались вдесятером. Получил травму их защитник, а две положенные замены к этому моменту уже были произведены. Казалось бы, минчане должны были получить прямую выгоду от игры в большинстве. Но тем не менее этого не случилось. Скорее наоборот. Поняв, что им терять уже нечего, запорожские футболисты вдруг заиграли довольно легко и непринужденно. На мой взгляд, помог им в этом и временно исполняющий обязанности главного тренера «Динамо» Михаил Вергеенко, заменивший Величко на Антоновича. Худо-бедно, но внушительная фигура почти двухметрового Величко привлекала к себе внимание, как минимум, двух защитников. Потеряв опекаемого, они ушли в атаку. А мы вдруг с грустью увидели команду образца конца прошлого сезона, лишь каким-то чудом не «вылетевшую» тогда в первую лигу.

Довольно беспорядочно заиграла защита минчан. Особенно много ошибок, как, кстати, и в предыдущем матче, совершал Родненок. В штрафной площадке раз за разом, по выражению болельщиков, возникал пожар. Все эти страсти прекратил лишь финальный свисток.

Впрочем, не будем строги: матч на матч не приходится. Победная серия продолжена, и это главное. В сердце болельщика уже мелькает надежда... на медали. Или хотя бы на место, дающее право на участие в европейском турнире.

Чем черт не шутит. Ведь рост у команды есть. Довольно прочно занял вакантное место опорного полузащитника молодой Журавель. Как выяснилось, обладающий неплохими диспетчерскими способностями, поставленным ударом. Порой их взаимодействие с Жутой напоминает те времена, когда линия полузащиты минчан, определяющая, кстати, игру любой команды, считалась лучшей в стране.

Но не будем забегать вперед. Нас ждет еще целый круг чемпионата...

Валерий ДРОЗДОВ.

Памяць

# Салдацкая скрыпка

**У Бешанковіцкім гісторыка-краязнаўчым музеі ёсць цікавы экспанат — салдацкая скрыпка, якую разам з аўтаматам пранёс па цяжкіх дарогах вайны яе гаспадар і музыка Даніла Паўлавіч Аўчыннікаў.**

У глыбокае мінулае ідуць карані творчасці і ўмельства дынастыі Аўчыннікавых. Па ўсёй бешанковіцкай акрузе ішла народная слава пра Рамана Фёдаравіча Аўчыннікава, знахара вёскі Ільячова. Ён майстраваў неабходныя для хатняга ўжытку рэчы: калаўроты, куфры, крэслы, ткацкія станкі-кросны і шмат чаго іншага. Самая каштоўная рэч, зробленая яго рукамі, — скрыпка.

Яго сын Павел Раманавіч не толькі майстраваў, але і ўмеў добра іграць на скрыпцы. Сваю любоў да народнай музыкі і песень ён таксама перадаў сыну Данілу. Як толькі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Даніла Аўчыннікаў быў прызваны на фронт, дзе адважна змагаўся з ворагам, праяўляючы мужнасць і гераізм, за што быў узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны другой ступені, Славы трэцяй ступені і дзевяццю баявымі медалямі.

У час зацішша пасля баёў іграў на скрыпцы салдат-скрыпач Даніла Аўчыннікаў, уздымаў настрой сваіх таварышаў па зброі.

Калі скончылася вайна, Даніла Аўчыннікаў працаваў трактарыстам у родным калгасе імя Кірава, механікам-слесарам. І не забываў пра скрыпку.

А як не стала народнага музыкі, скрыпку і іншыя яго салдацкія рэліквіі жонка перадала музею.

К. ХРУЦКІ,
ветэран вайны і працы.
г. п. Бешанковічы.

Майстэрня

# Капітан выбірае жывапіс

## Развітаўшыся з афіцэрскімі пагонамі, ён знайшоў сябе ў мастацтве

**Часцей за ўсё мы ўяўляем сабе мастакоў гэткімі патлатымі дзівакамі з запалымі вачыма, якія жывуць па сваіх, толькі ім вядомых законах.**

Часцей за ўсё мы ўяўляем сабе афіцэраў гэткімі суровымі дзецюкамі, якія ўмеюць толькі аддаваць загады, сачыць за сваёй ваеннай выпраўкай і для якіх мастацтва — дзіцячыя выбрыкі.

Разглядаю работы былога капітана Савецкай Арміі, а цяпер — члена Саюза мастакоў СССР Яўгена Карманава, выстава якога прайшла з 10 па 25 чэрвеня ў рэспубліканскім Доме мастацтваў, задумваюся адначасова над складанасцямі чалавечага лёсу.



Вось пейзажы, напісаныя мастаком яшчэ ў пару яго маладосці, калі юнак быў вайскоўцам. Жывапіс не сказаць каб вызначаўся нейкай арыгінальнасцю, але прафесіяналізм адчуваецца без усялякага сумнення. Як жа спалучыліся ў адной асобе свабодалюбівая, неўтаймаваная натура творцы і больш схільны да суровай армейскай дысцыплінаванасці характар чалавека ваеннага?

Яўген Аляксандравіч праслужыў амаль 20 гадоў. Вучыўся ў Курскім сувораўскім вучылішчы, затым перавёўся ў Разань, паступіў у Ленінградскі Чырванасцяжны ваенны інстытут фізкультуры і спорту імя Леніна, адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні Акадэміі мастацтваў СССР. Перад гэтым быў дзетдом. Пасля гэтага — перавод на Беларусь, у Мар'іну Горку, завочная вучоба ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце на аддзяленні манументальнага жывапісу. У 1962 годзе Карманаў назаўсёды развітваецца з капітанскімі пагонамі, пераводзіцца на дзённае навучанне, увесь аддаецца любімай справе.

Вось такая яго кароценькая біяграфія, яго пошукі самога сябе.

Ці знайшоў сябе Яўген Карманаў? Адказ можа быць толькі ў яго карцінах. Кідаюцца ў вочы веснавыя пейзажы. Удала выканана ранняя вясна: паветра набрыняла цяжкай цёплай вільгаццю, снег таксама цяжкі, дрэвы хоць і голыя, але ў іх адчуваецца жыватворная, прагнучая жыцця сіла. А знешне — ніякага намёку на вясну: снег, голыя дрэвы і ніводнай праталінкі. Толькі зіма на яго карцінах зусім іншая — празрыстая, светлая, марозная.

Партрэтны жывапіс Карманава быў прадстаўлены ў экспазіцыі цэлым шэрагам карцін, на якіх — суцэльны генералітэт.

— Будучы сам сувораўцам, я вырашыў да 50-годдзя сувораўскага ваеннага вучылішча стварыць цэлую галерэю партрэтаў яго выпускнікоў — генералаў, — зазначае гаспадар выставы.

Манументальны жывапіс — яшчэ адзін раздзел творчасці Яўгена Аляксандравіча. Гэта яго асноўнае рамяство. Керамічныя работы мастака вы можаце ўбачыць у шпіталі ветэранаў вайны ў Бараўлянах, на фасадах цэнтральнай школы ў Наваполацку, у стаматалагічнай клініцы № 8 у Мінску, у санаторыі «Беларусь», што ў Сочы, у іншых месцах. Калі ж пабываць там не давядзецца, наведайце станцыю метро «Плошча Якуба Коласа». У яе афармленні Я. Карманаў прымаў самы непасрэдны ўдзел і шмат якія элементы мог бы назваць аўтарскімі.

А вось тое, што мне так хацелася ўбачыць. Творчая індывідуальнасць аўтара найбольш ярка выражана ў манументальных работах «Салют» і «Фантазія», выкананых з бетону і керамічнай мазаікі. Дарэчы, пяць манументальных твораў яго дэманстраваліся на ўсесаюзных выставах. Але ад іх патыхае авангардам, да якога я стаўлюся насцярожана...

Графіка. Разглядаю, і мне падаецца, што менавіта яна — графіка, а, магчыма, яшчэ і акварэлі — лепшае, што стварыў за сваё жыццё Яўген Карманаў. І хоць ён затраціў на гэта значна менш часу, чым на партрэты і манументалістыку, тут ёсць усё: і высокі прафесіяналізм, і ўнутраны свет, паэзія аўтара, і непаўторнасць, і пераходзячая з карціны на карціну захапляючая няскончанасць — штуршок да ўключэння ў работу фантазіі гледачоў...

Пазнаёміўшыся з творчасцю Яўгена Карманава, магчыма, кожны з вас зробіць свае, зусім адрозныя ад маіх, высновы. Што ж, і дзякуй Богу.

А. ДРАГУН.

# Программа телепередач

## Среда, 3 июля

**Программа БТ**

**12.30.** «Актерские байки». Лев Дуров.
**13.05.** «Верую». Док. фильм.
**13.30.** «Волшебник Изумрудного города», 4, 5, 6-я серии.
Экран — абитуриенту
**14.35.** Белорусская литература.
**15.05.** История СССР.
**15.35.** Физика.
**16.05.** «Сивограк». Телеспектакль.
**17.15.** Телеклуб «Поиск».
**18.00.** «Продолжение жизни». Док фильм.
**18.25.** «Память». Телеочерк.
**19.00.** Панорама.
**19.25.** Наш комментарий.
**19.30.** «Плач перепелки». 2-я серия.
**20.45.** Колыбельная.
**21.00.** «Свята». Фильм-концерт.
**21.40.** «Живая память войны».
**21.55.** «Какая музыка была, какая музыка звучала...» Концерт по заявкам ветеранов.
**22.40.** Эхо дня.
**22.50.** «Я родом из детства». Худ. фильм.

**Первая общесоюзная программа**

**12.00.** ТСН.
**12.15.** Актуальный репортаж.
**12.30.** «В доме на Самотеке». Фильм-спектакль.
**15.00.** ТСН.
**15.15.** Мир увлеченных. «Коллекционер».
**15.30.** На балу у Золушки.
**16.35.** «На земле этой вечной». Док. фильм.
**17.05.** Мультфильм.
**17.25.** Фильм — детям. «Бронзовая птица». 1-я серия.
**18.30.** ТСН.
**18.45.** С. Рахманинов. Симфоническая фантазия «Утес».
**19.00.** Телекомпания «Уорлдвижн энтерпрайзес» представляет. «Семья Джетстонов». Мультфильм.
**19.25.** «Дорога в рай». Премьера худ. фильма.
**21.00.** Время.
**21.40.** «Даллас». 3-я серия.
**22.30.** «Русская душа». Людмила Рюмина.
**23.15.** Экологические новости.
**23.30.** Телескоп.
**0.30.** ТСН.
**0.50.** И. Стравинский. «Весна священная». Симфоническая сюита.
**1.30.** «Дорога в рай». Премьера худ. фильма.

**Вторая общесоюзная программа**

**10.20.** «Сегодня и завтра». Худ. фильм. 1-я серия.
**11.30.** Гомо советикус. «Путь к последнему приюту».
**12.00.** «Другое искусство».
**17.00.** «Перепевы». Фольклорное обозрение.
**17.50.** Неизвестная Россия. Российские меценаты.
**18.30.** ТПО «Республика» показывает.
**19.00.** Теннис. Уимблдонский турнир.
**20.00.** Вести.
**20.15.** Спокойной ночи, малыши!
**20.30.** Коллаж.
**20.35.** История Спартакиады народов СССР.
**20.50.** Маленький концерт.
**21.00.** Время.
**21.40.** На сессии Верховного Совета РСФСР.
**22.25.** X летняя Спартакиада народов СССР. Спортивная гимнастика.
**23.00.** Вести.
**23.15.** Телевизионный фильм «Мексиканцы на фоне страны». Фильм 1-й.
**0.05.** Эти обаятельные провинциалы.

**Астрономический календарь—3.07**

○ *ВОСХОД И ЗАХОД СОЛНЦА: Минск — 4.42,21.43; Витебск — 4.24,21.42; Могилев — 4.32,21.33; Гомель — 4.39, 21.20; Гродно — 5.00, 21.57; Брест — 5.09,21.48*

□ *ДОЛГОТА ДНЯ В МИНСКЕ — 17 часов 01 минута*

○ *ПОСЛЕДНЯЯ ЧЕТВЕРТЬ — 5 июля*

## Погода

Сегодня днем по республике ожидается переменная облачность, по югу местами кратковременные грозовые дожди. Температура воздуха в Гродно, Бресте —25—27; Минске —26—28; Витебске —28—30; Могилеве —30—32, Гомеле —31—33 градуса тепла.



НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор и дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, калі ў матэрыялах змешчаны даныя, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

Лісты чытачоў друкуюцца на мове арыгіналаў.

Рэдакцыя «НАРОДНАЙ ГАЗЕТЫ» прымае заказы на змяшчэнне аб'яў, рэкламы. Даведкі часова па тэлефоне 29-66-59.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220010, Мінск, Дом урада, пакой 369, тэл. 29-65-50.

ИНДЕКС 63868.
Выходит ежедневно, кроме воскресенья и понедельника, 250 раз в году.
Тираж 300 тыс. экз.
Подписана в печать в 19.10.
Отпечатана в ордена Трудового Красного Знамени типографии издательства ЦК КПБ.
Способ печати — офсетный, формат А-2.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ.